# «Народжанныя ў Беларусі»

Новы сумесны праект «Народжаныя ў Беларусі!», пры свечаны Году роднай зямлі, праводзяць цяпер Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі і Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя.

Яго мэта — выхаванне нацыянальнага і грамадзянскага сумлення праз вывучэнне гісторыі, традыцый, культуры краіны. Больш падрабязна пра праект мы папрасілі расказаць старшыню Цэнтральнага Савета Беларускай рэспубліканскай піянерскай арганізацыі Наталлю АБРАВЕЦ.

— У рамках праекта запланаваны самыя розныя творчыя конкурсы, экалагічныя і культурныя мерапрыемствы. На прыклад, творчы конкурс «Люблю наша» прадугледжвае выпуск стыльнай сучаснай сувенірнай прадукцыі з аднайменным слоганам. Прапанаваны цікавы новы праект — «BY!». У яго рамках на працягу года актывісты БРСМ і піянерскай арганізацыі будуць ладзіць моладзевыя акцыі ў падтрымку сучасных беларускіх тавараў. У прыватнасці, экскурсіі «Ведай нашых» на фабрыкі беларускіх вытворцаў для дашкольнай, навучэнскай, студэнцкай моладзі. Таксама прадугледжваеца, што ў буйных крамах валанцёры ў адзенні са стылізаванымі элементамі беларускага народнага касцюма будуць арганізоўваць сумесна з прадпрыемствамі работу спе цыяльных пляцовак, дзе праводзяцца дэгустацыі беларускіх прадуктаў. Падчас мера прыемстваў будзе гучаць беларуская народная музыка, а ўдзельнікі акцыі будуць раздаваць стылізаваныя рэкламныя флаеры з інфармацыяй пра перавагі беларускай прадук цыі, пра традыцыі вытворчасці з заклікамі падтрымліваць «сваё».

Хочацца прыгадаць яшчэ творчы конкурс «Гімн праекта» — гэта конкурс песні пра Беларусь, родную зямлю. Конкурс на лепшы крэатыў у рэкламе бела рускіх тавараў (аўдыё- і відэаролікі, бігборды) — «Крэатыў, «BY!». Пройдуць конкурсы малюнкаў «Народжаныя ў Беларусі», фестываль нацыянальнай кухні «Смачна есці!». Падчас фэсту будуць распрацоўвацца, а затым распаўсюджвацца лістоўкі-флаеры з рэцэптамі беларускай кухні.

Запланаваны і пленэры з маладымі мастакамі (студэнтамі мастацкіх ВНУ і каледжаў), юнымі мастакамі з дзіцячых мастацкіх школ і гурткоў. Па выніках пленэраў у моладзевай мастацкай галерэі будзе арганізавана выстава беларускіх пейзажаў. На працягу года пройдзе ролевая спартыўная гістарычная гульня «Мой горад», накіраваная на вывучэнне істарычных, культурных месцаў беларускіх гарадоў; фотамарафон «Аб'ектыўна» з фотаработ пра Беларусь, зробленых як маладымі прафесійнымі фотамастакамі, так і простымі абывацелямі, дзецьмі. Па выніках фотамарафону будзе створаны фотабанк беларускіх краявідаў.

— А якія экалагічныя праекты будуць праведзены ў Год род най зямлі?

— Безумоўна, экалагічныя акцыі таксама распрацоўваюцца. Да прыкладу, у Мінску плануецца праект «Дом, у якім я жыву». У сталіцы ёсць піянерскі сквер, яго і мяркуем добраўпарадкаваць. Ва ўсіх абласцях і Мінску пройдзе экалагічная акцыя «Падары дзень свайму гораду!», якая мае на мэце добраўпарадкаванне гарадоў і прылеглых тэрыторый, пасадку дрэў. Прапануем шмат цікавых напрамкаў і формаў работы для таго, каб пярвічныя арганізацыі БРСМ і піянерскія дружыны маглі гэта рэалізоўваць на месцах. Галоўная мэта — прапаганда ўсяго беларускага: культуры, роднай мовы, тавараў. І ў нас шмат ідэй. Галоўнае, іх рэалізаваць у жыцці, каб там, дзе мы жывём, і тое, што навокал, было сапраўды прыгожым. І, дарэчы, нашы экалагічныя акцыі цесна звязаны з іншым нашым праектам «65». У яго рамках праходзяць такія акцыі як па навядзенні парадку на мемарыялах, добраўпарадкаванні воінскіх пахаванняў, як, да прыкладу, «Абеліск». У прыватнасці, ёсць пахаванні, якія размешч ны ў лясных масівах. І актывісты ўжо аднавілі некаторыя з іх, навялі парадак.

Ну і, безумоўна, у канцы года мы спадзяёмся, што атрымаем вялікую колькасць прыгожых рэкламных праектаў: фатаграфіі, малюнкі, лагатыпы пад лозунгам «Народжаныя ў Беларусі». Усё гэта будзе выкарыстоўвацца ў

нашых рэкламных матэрыялах, будзе вывешвацца і ў сталіцы, і ў гарадах па ўсёй краіне. Насамрэч годныя работы павінны быць паказанымі, каб наша акцыя прымусіла людзей задумацца і акцэнтаваць увагу на роднай зямлі і краіне.

***Святлана СУХАРКО***

**Источник:** Звязда.-2009.- 15 мая.-С.4.